Кніжнае вымярэнне

Гродзенская праўда, 2012, 15 верасня, С.5

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ «ГРОДЗЕНСКАЙ ПРАЎДЫ» І АБЛАСНОЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ Я. Ф. КАРСКАГА



## ПЕРШЫЯ ЧЫТАЧЫ – МАНАХІ

Бібліятэкі з'явіліся яшчэ ў часы Гарадзенскага княства, што было звязана з узнікненнем пісьменства і распаўсюджваннем рукапісных кніг. У гэты час дамінуючую ролю мелі манастырскія бібліятэкі, якія ўяўлялі сабой не толькі кнігазборы, майстэрні па перапісванню кніг, але і цэнтры распаўсюджвання пісьменства сярод насельніцтва. Буйнейшая – бібліятэка Лаўрышаўскага Багародзічнага манастыра на Наваградчыне. На жаль, з яе фондаў да нашых дзён дайшло толькі «Лаўрышаўскае Евангелле» (XIV ст.), якое захоўваецца ў бібліятэцы імя Чартарыйскіх у Кракаве.

У XIV–XVI стагоддзях большасць бібліятэк месцілася пры праваслаўных манастырах: Гарадзенскім Барыса-Глебскім мужчынскім на Каложы, Гарадзенскім «малапапоўскім», што каля замка, Наваградскім Барыса-Глебскім і іншых.

Са з'яўленнем каталіцкага касцёла і кляштараў сфарміраваліся бібліятэкі іншага тыпу. Праз кляштарныя бібліятэкі з Захаду шырока распаўсюджвалася еўрапейская кніга, у тым ліку і свецкая. Практычна ва ўсіх буйных гарадах Гарадзеншчыны дзейнічалі падобныя бібліятэкі. У Гародні іх было 6, у Наваградку – 4. Самая вялікая – бібліятэка Гарадзенскага дамініканскага манастыра і школы – мела больш за 10 тысяч тамоў інкунабул, палеатыпаў, рэдкіх

свецкіх выданняў XVI-XVIII стагоддзяў і рукапісаў.

З 1669 года пачала дзейнічаць бібліятэка Слонімскага канвента бенедыктынак. Бібліятэкі каталіцкага ордэна піяраў былі найбольш прагрэсіўнымі. Так, у бібліятэцы піярскага кляштара ў Шчучыне было 1,5 тысячы кніг, сярод якіх пераважала літаратура па прыродазнаўству, медыцыне, матэматыцы.

З цягам часу склалася сістэма бібліятэк уніяцкага ордэна базыльян, асновай для якіх часцей за ўсё служылі бібліятэкі праваслаўных манастыроў. У Жыровіцкім манастыры было некалькі кнігазбораў: бібліятэка Успенскага сабора, галоўная манастырская бібліятэка, бібліятэка базыльянскай ордэнскай школы, бібліятэка свецкай школы пры манастыры.

Найбольш значная пратэстанцкая бібліятэка была ў Смаргонскім кальвініcцкім зборы. Дзейнічалі бібліятэкі пратэстанцкіх цэркваў магнацкіх рэзідэнцый у Любчы, Наваградку, Іўі.

## З ПРЫВАТНЫХ КНІЖНЫХ ШАФАЎ

Славіліся ў Еўропе і магнацкія бібліятэкі з Гарадзеншчыны. Буйнейшымі сярод іх былі бібліятэкі Храптовічаў і Сапегаў.

Прыватны кнігазбор Сапегаў быў другім па велічыні на Беларусі пасля бібліятэкі Радзівілаў. Пачатак кнігазбору дала ружанская бібліятэка канцлера ВКЛ Льва Сапегі, якую

У XVIII стагоддзі ружанскі збор быў пераведзены ў Дзярэчын на Зэльвеншчыне і значна папоўнены Аляксандрам, Міхалам, Францыскам Сапегамі.

У другой палове XVIII стагоддзя пачынае фарміраваць сваю бібліятэку ў Шчорсах Іаахім Храптовіч, стаўшы спачатку падканцлерам, а потым канцлерам ВКЛ. Будучы ініцыятарам і актыўным дзеячам адукацыйнай камісіі, ён меў магчымасць не толькі купляць каштоўныя кнігі, але і перапісваць дакументы з архіваў. Адных толькі твораў аўтараў з тэрыторыі Рэчы Паспалітай у яго бібліятэцы налічвалася 6 тысяч, былі ў ёй інкунабулы, палеатыпы, рэдкія выданні кірыліцаю. Асабліва каштоўным быў збор рукапісаў. Цяпер гэтыя рукапісы ў поўным складзе захоўваюцца ў ад-

най бібліятэкі Украіны імя Вярнадскага. Пасля 1768 года кнігазбор папоўніўся выданнямі з бібліятэкі епіскапа Ю.Залускага і купленым у Рыме зборам кардынала І. Імперыале. Асаблівую ўвагу ўладальнікі аддавалі краязнаўству, у выніку была сабрана вялікая калекцыя кніг, карт і эстампаў па гісторыі і геаграфіі літоўска-беларускіх зямель.

Багатыя зборы мелі прыватныя бібліятэкі Радзівілаў у Любчы, Казіміра Храмінскага ў Свіслачы, Солтанаў у Дзятлаве, Патоцкіх у Росі і Залессі, Плятэраў у Даўгелішках.

Значным кнігазборам валодаў знакаміты гісторык і археолаг Тэадор Нарбут у маёнтку Шаўры Лідскага павета (зараз Воранаўскі

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ МЕДЫКАЎ

У 1775 годзе была створана першая спецыяльная навуковая бібліятэка – бібліятэка медыцынскай акадэміі (школы) у Гродна. У 1780 годзе яна налічвала 3000 тамоў, пераважна навуковай літаратуры, прычым 500 выданняў сучаснікі адносілі да асабліва рэдкіх. Камплектаванне бібліятэкі навуковай літаратурай было на вышэйшым узроўні. Тут была Французская энцыклапедыя, энцыклапедыя Планшэ, рэдкія медычныя і астранамічныя выданні. Бібліятэку медыцынскай акадэміі перадаў у Віленскі ўніверсітэт Іаахім Храптовіч.

**Любоў ТУРМАСАВА,**
**загадчык аддзела краязнаўства абласной навуковай бібліятэкі**

## ДАВЕДКА

**ІНКУНАБУЛЫ** (ад лац. Incunabula – «калыска», «пачатак») – кнігі, выдадзеныя ў Еўропе ад пачатку кнігадрукавання да 1 студзеня 1501 года. Выданні гэтага перыяду вельмі рэдкія, так як іх наклад быў 100–300 асобнікаў.

**ПАЛЕАТЫПЫ** – умоўная назва еўрапейскіх друкаваных кніг, выдадзеных з 1 студзеня 1501 года да 1